Бібліятэка "Лабараторыі"

# Пра свой соцыум

**Працягваем знаёміцца з "Тэхналогіямі культурна-дасугавай дзейнасці". Аўтарамі дапаможніка для работнікаў культуры з'яўляюцца выкладчыкі кафедры менеджменту сацыяльна-культурнай дзейнасці БДУКіМ Алена Макарава, Святлана Майсейчук і Ірына Смарговіч.**

Яўген РАГІН

Рэальную і патэнцыйную аўдыторыю ўстаноў культурна-дасугавай сферы звычайна дзеляць на наступныя ўзроставыя групы: дзеці, падлеткі, моладзь, людзі сярэдняга веку, сталыя людзі; асобна вылучаюць сям'ю як аб'ект уплыву.

**Апрача ўзросту, сямейнага становішча і сацыяльнага статусу існуюць іншыя крытэрыі, якія дазваляюць сегментаваць дасугавы сэрвіс, у найбольшай ступені ўлічваючы асаблівасці запытаў.**

Дыферэнцаваны падыход рэалізуецца і з улікам гендарных прыкмет. Часцяком інтарэсы мужчын і жанчын у культурна-дасугавай сферы розняцца. Для жанчын ствараюцца адпаведныя клубы, спартыўна-аздараўленчыя групы гімнастыкі, усходняй медыцыны, гурткі ўсходняга танца, курсы кройкі і шыцця, вядзення хатняй гаспадаркі. Мужчыны наведваюць клубы аўтааматараў, паляўнічых і рыбаловаў, спартыўных заўзятараў; яны ствараюць байкерскія клубы і іншыя.

**Важным фактарам з'яўляецца таксама ўлік месца пражывання. Перавагі жыхароў горада і сяла заўважна адрозніваюцца і ў сілу традыцый, і праз наяўнасць інфраструктуры. Вясковы клуб ці бібліятэка часта з'яўляюцца адзіным цэнтрам культуры.**

Дзіцячы ўзрост — да 11-12 гадоў. Ствараючы ўмовы для развіцця асобы і маючы гуманістычную скіраванасць, культурна-дасугавая дзейнасць дазваляе задаволіць патрэбу дзіцяці ў творчай рэалізацыі. Такі дасуг важны для зняцця эмацыйнага напружання, гарманізацыі псіхалагічнага стану.

**Культурна-дасугавая дзейнасць садзейнічае выхаду са стрэсаў і дробных непакойстваў, а таксама прызнаецца значным арттэрапеўтычным сродкам у папярэджанні разумовай адсталасці і рэабілітацыі дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця.**

К

Працяг — **у наступных нумарах "К".**

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКіМ